# РЭАРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАЙ СІСТЭМЫ Ў ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІМ РЭГІЁНЕ ПАСЛЯ ВЕРАСНЁЎСКІХ ПАДЗЕЙ 1939 г.

***Г. С. Хадасевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, annahadasevich@gmail.com*

Адной з найважнейшых задач, на далучаных пасля верасня 1939 года заходнебеларускіх землях, была задача рэарганізацыі сістэмы народнай адукацыі. Для рэалізацыі гэтай праграмы неабходны былі вялікія матэрыяльныя і фінансавыя сродкі. Савецкія органы ўлады імкнуліся рэарганізаваць навучальныя ўстановы і ўкараніць савецкія адукацыйныя стандарты ў сферу адукацыі. Усе пераўтварэнні праводзіліся ў адпаведнасці з інструкцыяй Народнага Камісарыята асветы БССР "Аб парадку рэарганізацыі школ Заходніх абласцей БССР" (снежань 1939 г.). Згодна з яе рэалізацыяй, пераадольваючы пэўныя цяжкасці, уводзілася савецкая сістэма народнай адукацыі. Адукацыйная палітыка савецкага кіраўніцтва станоўча адбілася і на стане культуры рэгіёна.

***Ключавыя словы:*** Заходняя Беларусь; заходнебеларускі рэгіён; савецкія органы ўлады; савецкая сістэма адукацыі; Народны Камісарыят асветы БССР; рэарганізацыя.

# РЕОРГАНИЗАЦИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ СИСТЕМЫ В ЗАПАДНОБЕЛОРУССКОМ РЕГИОНЕ ПОСЛЕ СЕНТЯБРЬСКИХ СОБЫТИЙ 1939 Г.

***А. С. Ходосевич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, annahadasevich@gmail.com*

Одной из важнейших задач, на присоединенных после сентября 1939 года западнобелорусских землях, была задача реорганизации системы народного образования. Для реализации этой программы необходимы были большие материальные и финансовые средства. Советские органы власти стремились реорганизовать учебные заведения и внедрить советские образовательные стандарты в сферу образования. Все преобразования проводились в соответствии с инструкцией Народного Комиссариата просвещения БССР «О порядке реорганизации школ западных областей БССР» (декабрь 1939г.). Согласно ее реализации, преодолевая определенные трудности, вводилась советская система народного образования. Образовательная политика советского руководства положительно отразилась и на состоянии культуры региона.

***Ключевые слова:*** Западная Белоруссия; западнобелорусский регион; советские органы власти; советская система образования; Народный Комиссариат просвещения БССР; реорганизация.

# REORGANIZATION OF THE EDUCATIONAL SYSTEM IN THE WESTERN BELARUSIAN REGION FOLLOWING THE SEPTEMBER EVENTS OF 1939.

***H. S. Khadasevich***

*Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, annahadasevich@gmail.com*

One of the most important tasks in the Western Belarusian lands annexed after September 1939 was the task of reorganizing the public. In order to implement this programme, vast material and financial resources were required. Soviet authorities sought to reorganize educational institutions and to introduce Soviet educational standards into the field of education. All transformations were carried out in accordance with the instructions of the People's Commissariat of Education of the BSSR "On the procedure for reorganizing schools in the western regions of the BSSR" (December 1939). According to its implementation, overcoming certain difficulties, the Soviet system of public education was introduced. The educational policy of the Soviet leadership had a positive impact on the state of culture in the region.

***Key words:*** Western Belarus; Western Belarusian region; Soviet authorities; Soviet educational system; People's Commissariat of Education of the BSSR; reorganization.

Пасля завяршэння пахода Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь перад партыйнымі і дзяржаўнымі органамі ўлады стаялі першачарговыя задачы па правядзенню тэрытарыяльнага і палітычнага ўладкавання, наданню жыццядзейнасці эканоміцы і сацыяльна-культурнай сферы на новай ідэалагічнай платформе.

Асаблівую ўвагу савецкая ўлада на далучаных заходнебеларускіх тэрыторыях надавала пытанню народнай асветы. З аднаго боку, для бальшавікоў, якія трымаліся традыцый асветніцтва, доступ усіх сацыяльных і нацыянальных катэгорый грамадства да асветы сам па сабе быў ключом да яго перабудовы на новы лад. З іншага боку, праз ажыццяўленне адукацыйнай палітыкі яны хацелі спрыяць развіццю мясцовых культур – беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай, – што ў сваю чаргу дазваляла ім больш якасна прапагандаваць свае ідэі сярод народных мас. Аднак для рэалізацыі гэтых задумак неабходна было правесці вялікую работу, задзейнічаць значныя матэрыяльныя рэсурсы і фінансавыя сродкі, а таксама выкарыстаць усе магчымасці для павелічэння адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, праз стварэнне дзеля гэтага патрэбных умоў.

Вырашыць у кароткі тэрмін вышэй акрэсленыя задачы савецкае кіраўніцтва імкнулася праз рэарганізацыю вучэбных устаноў – укараненне савецкіх адукацыйных стандартаў у сферу асветніцтва. Першапачаткова выкананне дадзеных партыйных загадаў было прызначана на мясцовыя органы кіравання – часовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты, якія хоць і

паказалі адносна станоўчую дынаміку ў гэтым накірунку (будаваліся новыя школы, а існуючыя пераводзіліся на дзяржаўны бюджэт; адмянялася плата за навучанне і інш.), але з-за хаатычнасці, непаслядоўнасці сваіх дзеянняў, не здолелі паскорыць гэты працэс. Тады ініцыятыву перахапіў рэспубліканскі Народны камісарыят асветы, які стаў забяспечваць заходнія вобласці БССР настаўніцкімі кадрамі, падручнікамі і метадычнай літаратурай, сшыткамі і інш. Напрыклад, як паведамляла народны камісар асветы БССР Е. Уралава ў пісьме аддзелу прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б ад 21 лютага 1940 г., за перыяд з 15 лістапада 1939 г. па 15 лютага 1940 г. у заходнебеларускі рэгіён было адпраўлена: 1610 тыс. экземпляраў падручнікаў, з якіх на беларускай мове – 1018650 экз., на рускай – 560000 экз., на польскай – 2350 экз. і інш.; 26 тыс. экз. вучэбных праграм; больш за 6 млн. сшыткаў. Прапаноўвалася дадаткова яшчэ адправіць каля 2 млн. экз. падручнікаў, каб у поўным аб'ёме забяспечыць імі школьнікаў да новага навучальнага года [1, арк. 50].

Наркамат асветы БССР у снежні 1939 г. выдаў інструкцыю «Аб парадку рэарганізацыі школ заходніх абласцей БССР», згодна з якой у гэтым рэгіёне ўводзілася савецкая сістэма народнай адукацыі. Пачынаючы з 15 студзеня 1940 г. былыя польскія гімназіі, ліцэі і школы рэарганізоўваліся ў пачатковыя, няпоўныя сярэднія і сярэднія школы. Таксама ўводзілася ў практыку ўсеагульнае абавязковае сямігадовае школьнае навучанне для дзяцей. Усе дзеці ва ўзросце ад 8 да 11 гадоў, якія не былі ахоплены навучаннем, павінны былі пайсці ў школы ў тэрмін да 15 студзеня. Для дзяцей жа 11–14 гадоў ствараліся ў вучэбных установах спецыяльныя класы, дзе дзеці навучаліся па спецыяльнай праграме.

Важным было пытанне падрыхтоўкі педагагічных кадраў. У снежні 1939 г. у заходніх абласцях Беларусі былі праведзены настаўніцкія канферэнцыі і семінары, удзельнікі якіх абмяркоўвалі праблему стварэння ў вучэбных установах неабходных навучальна-выхаваўчых умоў працы. Аднак асаблівая ўвага была звернута на перавыхаванне настаўнікаў, згодна з новымі ідэйна-палітычнымі рэаліямі. Гаворка тут ішла найперш аб арганізацыі шырокай і сістэматычнай работы з настаўнікамі наконт абгрунтавання палітыкі савецкай дзяржавы, аб актыўным удзеле выкладчыкаў у грамадскім жыцці краіны і павышэнні іх прафесійных якасцяў. Менавіта такая праца вялася ў 1940 г. – першай палове 1941 г. Пад уздзеяннем агітацыі большасць настаўнікаў, што паходзілі з Заходняй Беларусі, хутка перавыхоўваліся, уступалі ў спецыяльныя прафесійныя

саюзы, дзейнасць якіх заўсёды кантралявалася рэспубліканскімі ўладамі, а таксама далучаліся да культурна-асветніцкай работы [4, с. 62].

Каб забяспечыць заходнебеларускае школьніцтва адпаведнай колькасцю педагагічных кадраў, быў створаны вялікі педагагічны інстытут у Беластоку, свае дзверы адчынілі і настаўніцкія інстытуты ў такіх гарадах, як Баранавічы, Пінск і Гродна. Апошні з іх быў на момант свайго адкрыцця – 20 лютага 1940 г. – першым у Заходняй Беларусі вышэйшым навучальным цэнтрам. Паўсюдна распачыналі сваю працу і настаўніцкія курсы. Тыя асобы, якія скончылі да 1939 г. польскія гімназіі, а затым прайшлі некалькі месяцаў навучання на настаўніцкіх курсах, атрымалі дастатковыя падставы для таго, каб мець магчымасць выкладаць у рабочым ці сялянскім асяродку. Аднак, як потым стала зразумела, мясцовых педагагічных кадраў было недастаткова для правядзення выхаваўчай работы сярод насельніцтва. На дапамогу ім савецкія ўлады пачалі адпраўляць настаўнікаў з усходніх рэгіёнаў БССР, якія, на думку партыйнага кіраўніцтва, былі больш надзейнымі ў ідэалагічным плане, чым іх калегі, што мелі пераважна польскае паходжанне [8, с. 197].

Разам з тым не ўсе прадстаўнікі заходнебеларускай інтэлігенцыі, у тым ліку і настаўнікі, захацелі прымаць савецкі лад жыцця. З іх боку бальшавікі сустрэлі моцнае супраціўленне. Для барацьбы з патэнцыйнымі ворагамі былі задзейнічаны органы дзяржбяспекі, асабліва рэспубліканскі НКУС. Як правіла, збор інфармацыі аб дзейнасці «контррэвалюцыйных элементаў» тут праводзіўся як кадравымі супрацоўнікамі, так і сакрэтнымі агентамі. Дзяржаўныя органы разумелі асаблівы ўплыў школы ў ажыццяўленні саветызацыі краю і таму ўважліва сачылі за настроямі ў настаўніцкім асяроддзі. Тых, хто падпадаў у такім выпадку пад аператыўнае вызначэнне «вораг», чакала або фізічная смерць, або работа ў якасці шпіёнаў сярод сваіх жа аднадумцаў [6, с. 407]. Пад жорсткім наглядам савецкіх спецслужбаў знаходзіліся школы, што функцыянавалі на тэрыторыях, набліжаных да заходняй мяжы. Так, у інфармацыйным паведамленні на імя сакратара Беластоцкага абкама КП(б)Б С. Ігаева за студзень 1940 г., між іншым адзначалася, што антысавецкую дзейнасць найбольш актыўна праводзілі мясцовыя настаўнікі-палякі, якія распаўсюджвалі сярод вучняў і іх бацькоў чуткі аб хуткім падзенні савецкай улады, аб міфічных польскіх партызанах, што наступалі з Карпат. Былі выпадкі, калі нават дырэктар Сакульскай гімназіі Кальдзейскі заклікаў вучняў не прытрымлівацца савецкіх законаў, катэгарычна забараняў настаўнікам спяваць з дзецьмі савецкія песні [1, арк. 1].

Для арганізацыі шырокай навучальна-выхаваўчай работы сярод мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі існуючай на восень 1939 г. сеткі вучэбных установ было недастаткова. З мэтай паляпшэння гэтага становішча савецкая ўлада разгарнула кампанію па будаўніцтву новых школ. Так, у Брэсцкай вобласці за 1940 г. было пабудавана каля 523 школ. У 1940/41 навучальным годзе у заходніх абласцях БССР функцыянавала 5959 агульнаадукацыйных школ, звыш 4500 з якіх ажыццяўлялі навучанне па-беларуску [5, с. 169]; з іх – 4670 пачатковых, 1169 няпоўных сярэдніх і 120 сярэдніх, у якіх вучылася прыблізна 774 тыс. дзяцей [7, с. 365]. Аднак не ва ўсіх рэгіёнах адбываліся падобныя працэсы. Напрыклад, як паведамляў намеснік наркома асветы БССР Макаркевіч у пісьме Воранаўскаму райкаму КП(б)Б ад 13 мая 1940 г., у сувязі з абмежаваннем лімітаў, будаўніцтва школ у дадзеным раёне ў 1940 г. па плану не прадугледжвалася [1, арк. 358].

Урад БССР на пачатковым этапе ставіў сваёй задачай сфарміраваць школьную справу ў Заходняй Беларусі па нацыянальнаму прынцыпу. Найперш гэта тычылася пераводу выкладання ў школах на беларускую мову і выдання беларускамоўных падручнікаў. Стварэнне сеткі беларускамоўных школ патрабавала адпаведнай кваліфікацыі ў настаўнікаў, для якіх арганізоўваліся адпаведныя курсы па вывучэнню мовы [1, арк. 42]. Праўда, не ўсе падтрымалі ініцыятыву аб пераводзе школ на беларускую мову выкладання. Як паведамляў у справаздачы сакратар Навагрудскага райкома КП(б)Б, у Навагрудскім раёне ў пачатку 1940 г., падчас рэарганізацыі школ мела месца грэблівае стаўленне да беларускай мовы як з боку бацькоў вучняў, так і настаўнікаў. Асабліва гэта назіралася ў вёсках, дзе сяляне патрабавалі адкрыць рускія школы, матывуючы тым, што беларуская мова не ёсць паказчык адукаванасці. Павятовыя сялянскія камітэты нават падавалі ва ўладныя інстанцыі скаргі і хадатайніцтвы аб выкладанні рускай мовы ў школах. Зменшыць напружанасць па дадзенай праблеме ўдалося не адразу, а толькі пасля правядзення масавай агітацыйнай работы [1, арк. 46–47]. Падобная сітуацыя адбывалася і ў Шчучынскім раёне, дзе падчас абмеркавання на сходзе пытання аб увядзенні беларускай мовы ў школьнае навучанне бацькі вучняў перашкаджалі прамоўцам, падымаючы ў зале крык [1, арк. 63]. Нягледзячы на жаданне савецкай улады адкрыць больш беларускамоўных школ у заходнебеларускім рэгіёне, паступова гэтая палітыка пачала згортавацца, а яе дасягненні аказаліся даволі нетрывалымі. З моманту актывізацыі рэпрэсій пачалася татальная русіфікацыя школьніцтва і сістэмнае

выцясненне беларускай мовы з грамадскага і культурнага жыцця краю [2, с. 167].

Паралельна існаваў яшчэ цэлы комплекс праблем, якія не давалі магчымасці для развіцця тут беларускай школьнай справы. Значная колькасць школ размяшчаліся ў зусім непрыстасаваных будынках, у якіх часта поўнасцю адсутнічала школьнае абсталяванне. Так, у Воранаўскім раёне ў красавіку 1940 г. 37 школ знаходзілася ў старых сялянскіх хатах, а ў райцэнтры школы ўвогуле не было [1, арк. 357]. У Навагрудскім павеце ўзнікла праблема запазычанасці па зарплаце настаўнікам, сума якой за снежань 1939 г. налічвала 19 000 руб., за студзень 1940 г. – ужо 300 000 руб. Акрамя гэтага за ліквідацыю непісьменнасці настаўнікі не атрымалі яшчэ каля 27000 руб. [1, арк. 47–48]. Як, дарэчы, пісаў старшыня фінупраўлення Наркамата асветы БССР Міркін у дакладной запісцы у ЦК КП(б)Б ад 16 лютага 1940 г., выплата зарплаты настаўнікам за студень 1940 г. была немагчымай, бо на месцах адсутнічалі грашовыя сродкі [1, арк. 49]. Не хапала падручнікаў, школы ў большасці выпадкў зусім не былі забяспечаны вучэбнымі праграмамі, сшыткамі, дзённікамі і інш. Нават сялянскім вучням не хапала абутку і вопраткі, з-за адсутнасці якіх яны не маглі наведваць урокі. Даходзіла да таго, што зімой некаторыя школы зачыняліся, бо элементарна не прывозіліся дровы.

Каб не страціць падтрымку з боку моладзі, партыйнае кіраўніцтва імкнулася стварыць сабе надзейную апору, арганізуючы ў школах і вучылішчах піянерскія і камсамольскія ячэйкі. Так, у кастрычніку 1940 г. у заходніх абласцях БССР налічвалася ўжо 650 піянерскіх атрадаў, якія аб’ядноўвалі каля 23 тыс. піянераў [3, с. 462]. Такія арганізацыі дазвалялі савецкай уладзе распаўсюджаваць камуністычную ідэалогію сярод маладога пакалення. Для дарослага насельніцтва краю прадугледжваліся вячэрнія рабочыя школы і школы па ліквідацыі непісьменнасці, ў якіх у пачатку 1941 г. амаль 170 тыс. дарослых наведвалі заняткі [9, с. 34] Аднак і ў гэтым накірунку прасочваліся значныя пралікі, звязаныя найперш з недахопам адпаведных падручнікаў і метадычнай літаратуры.

У працэсе рэарганізацыі адукацыйнай сістэмы значных зменаў зазнаў сацыяльны склад пачатковых і сярэдніх школ. Можна канстатаваць, што адукацыйная палітыка савецкага кіраўніцтва ў Заходняй Беларусі ў вызначаны перыяд у цэлым станоўча адбілася на стане культуры краю.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Документы о состоянии партийной, агитационно-массовой работы, развитии промышленности, сельского хозяйства, торговли, транспорта, народного

образования, здравоохранения в западных областях БССР (постановления, выписки из протоколов, докладные записки, справки и др. ): 3 января – 17 апреля 1940 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 17000. Арк. 1–364.
2. Высоцкі А. Вынікі саветызацыі беларускіх і ўкраінскіх земляў II Рэчы Паспалітай у 1939–1941 гг. з перспектывы культурнага сутыкнення // Беларускі гістарычны агляд. Вільня, 2011. Т. 18. Сш. 1–2. С. 141–185.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш. ]. Мінск: Экаперспектыва, 2006.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш. ]. Мінск: Беларуская навука, 2012.
5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Вучэбны дапаможнік / І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін і інш. / пад агульнай рэд. І. А. Марзалюка. Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2022.
6. Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: люди, события, документы: сб. науч. статей / под ред. О. В. Петровской, Е. Ю. Борисенок. СПб.: Алетейя, 2011.
7. История Белорусской ССР / редкол.: И. М. Игнатенко, Н. В. Каменская, И. С. Кравченко [и др. ]. Мінск: Наука и техника, 1977.
8. Латышонак А., Мірановіч Я. Гісторыя Беларусі з сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. Вільня–Беласток: Ін-т беларусістыкі, Беларускае гістарычнае таварыства, 2010.
9. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 2 / редкол.: А. А. Коваленя [и др. ]. Минск: Беларуская навука, 2014.